У краіне надаецца вялікая ўвага развіццю *фізічнай культуры і спорту*. Гэты від паслуг неабходны для падтрымання здаровага ладу жыцця. Функцыянуе каля 23 300 спартыўных аб'ектаў і збудаванняў. Сярод іх спартыўныя залы, плавальныя басейны, вяслярныя каналы, велатрэкі, стадыёны, манежы і іншыя аб'екты. Такія спартыўныя збудаванні, як «Мінск-Арэна», «Чыжоўка-Арэна», гарналыжныя комплексы «Сілічы» і «Лагойск», рэспубліканскія цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы», «Стайкі», «Ратамка» і іншыя, пастаянна прымаюць буйныя спартыўныя спаборніцтвы, вядомыя далёка за межамі краіны. На самым высокім узроўні ў Беларусі праводзяцца чэмпіянаты свету і Еўропы па хакеі, фігурным катанні, біятлоне і іншых відах спорту.

Вялікае значэнне ў сферы сацыяльных паслуг маюць культура і мастацтва. Прааналізуйце карту атласа (ст. 54) і вызначце размяшчэнне тэатраў, музеяў і іншых устаноў культуры па тэрыторыі Беларусі.

**Абагульнім і запомнім.** Адукацыя і ахова здароўя з'яўляюцца вядучымі відамі эканамічнай дзейнасці навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг і маюць сетку ўстаноў, распаўсюджаных па ўсёй краіне. Большасць устаноў навукі і культуры размешчаны ў буйных гарадах краіны.

1. На якія групы падзяляюцца ўстановы адукацыі і аховы здароўя? 2. Чаму турызм з'яўляецца адным з перспектыўных відаў эканамічнай дзейнасці?

3. Прааналізуйце карту атласа і растлумачце асаблівасці размяшчэння ўстаноў вышэйшай адукацыі. 4. Растлумачце, якім чынам установы аховы здароўя, фізкультуры і спорту, турызму ўдзельнічаюць у павышэнні якасці жыцця жыхароў Беларусі.

***Ад тэорыі да практыкі.*** Да сацыяльных паслуг адносяцца паслугі ўстаноў культуры. Распрацуйце для турыстаў рэкламны буклет, на якім адлюструйце інфармацыю пра найбольш значныя, на ваш погляд, установы культуры краіны (ці вашага населенага пункта).

## § 42. Геаграфія транспарту

***Узгадваем.*** *Для чаго выкарыстоўваецца транспарт? Якія віды транспарту вы ведаеце?*

**Фарміраванне і развіццё транспартнай сеткі.** У працэсе гістарычнага развіцця ўзнікае неабходнасць ажыццяўляць абмен таварамі, перамяшчаць розныя грузы. У кожнай краіне развіваецца транспарт як адзін з вядучых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг. Транспарт забяспечвае перавозку пасажыраў і грузаў з аднаго рэгіёна ў іншы, тым самым падтрымлівае

вытворчыя сувязі і спрыяе эканамічнаму развіццю. Падзяляецца транспарт на пасажырскі і грузавы. У структуры ВУП Беларусі доля транспарту складае 6 %.

У цяперашні час у краіне развіваюцца ўсе віды транспарту. Нават марскі транспарт прадстаўлены трыма транспартнымі кампаніямі, якія працуюць у галіне марскіх перавозак. Разам яны фарміруюць адзіную транспартную сістэму, якая ўключае некалькі блокаў (мал. 165). Геаграфічнае становішча Беларусі ў цэнтры Еўропы абумовіла фарміраванне густой **транспартнай сеткі** (сеткі шляхоў зносін).




Мал. 165. Транспартная сістэма Беларусі

**Транспартная сетка** — сукупнасць чыгуначных ліній, аўтамабільных дарог, ліній гарадскога транспарту, каналаў і водных шляхоў, магістральных трубаправодаў, па якіх ажыццяўляецца перавозка грузаў і пасажыраў у межах пэўных тэрыторый.

Гушчыня сеткі аўтамабільных дарог у Беларусі складае каля 490 км/1000 км$^2$, а гушчыня чыгунак — 26 км/1000 км$^2$. Па дадзеных паказчыках Беларусь апярэджвае многія краіны Еўропы. Густая сетка дарог абумовіла развіццё транспартных тэрміналаў, якія ўключаюць вакзалы, таварныя станцыі і іншыя аб'екты. У месцах перасячэння транспартных ліній утвараюцца **транспартныя вузлы**.

**Транспартны вузел** — комплекс тэхнічных збудаванняў, прылад і канструкцый на скрыжаванні або прымыканні некалькіх шляхоў зносін.

Штогод усімі відамі транспарту перавозіцца больш за 440 млн т грузаў. У Беларусі актыўна ўкараняюцца новыя віды перавозак грузаў

(кантэйнерная перавозка і інш.), скарачаецца час паездак і дастаўкі грузаў, будуюцца лагістычныя цэнтры, фарміруюцца транспартныя калідоры. У цяперашні час распрацавана Рэспубліканская праграма развіцця лагістычнай сістэмы і транспартнага патэнцыялу, створана больш за 20 лагістычных цэнтраў, большасць з якіх знаходзяцца вакол Мінска і Брэста.

**Чыгуначны транспарт.** Першая чыгунка ў Беларусі з'явілася ў 1862 г. Гэта быў невялікі ўчастак Гродна — Парэчча Пецярбургска-Варшаўскай магістралі. У цяперашні час створана чыгуначная сетка агульнай працягласцю 5480 км. Крыху больш за 20 % чыгунак электрыфікавана. Па грузаабароце чыгуначны транспарт саступае толькі трубаправоднаму, па пасажыраабароце — аўтамабільнаму (табл. 9).

*Табліца 9* — Структура груза- і пасажыраперавозак у Рэспубліцы Беларусь, 2017 г.

| Від транспарту | Перавозка грузаў | | | Перавозка пасажыраў | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго, млн т | Груза-абарот, млн т км | Груза-абарот, % | Усяго, млн чал. | Паса-жыра-абарот, млн пас. км | Паса-жыра-абарот, % |
| Чыгуначны | 146,3 | 48538,0 | 36,4 | 80,5 | 6295,0 | 25,3 |
| Аўтама-більны | 166,7 | 26982,0 | 20,2 | 1174,8 | 10406,0 | 41,9 |
| Трубапра-водны | 124,4 | 57708,0 | 43,3 | — | — | — |
| Водны | 2,0 | 32,0 | 0,1 | 0,2 | 2,0 | — |
| Паветраны | 0,06 | 83,0 | | 3,0 | 3949,0 | 15,9 |
| Гарадскі электрычны і метро | — | — | — | 697,0 | 4017,0 | 16,2 |
| Такса-маторны | — | — | — | 11,7 | 180,0 | 0,7 |

Чыгуначны транспарт мае вялікае значэнне пры перавозцы грузаў на вялікія адлегласці і актыўна выкарыстоўваецца ў знешнім гандлі з Расіяй, Украінай, краінамі Балтыі і Заходняй Еўропы, Казахстанам, Кітаем.

Да транс’еўрапейскага транспартнага калідора № II адносіцца найбольш загружаная электрыфікаваная чыгуначная магістраль Брэст — Мінск — Орша. Аналагічныя параметры мае чыгунка ў межах адгалінавання ад транспартнага калідора № IX Гомель — Мінск — Гудагай. Важную ролю ў краіне адыгрываюць неэлектрыфікаваныя магістралі Віцебск — Магілёў — Гомель (транспартны калідор № IX), Брэст — Лунінец — Калінкавічы — Гомель, Віцебск — Полацк — Даўгаўпілс, Вільнюс — Ліда — Баранавічы — Лунінец — Сарны, Баранавічы — Слуцк — Асіповічы — Магілёў і інш. Мяжу Беларусі і суседніх краін перасякаюць чыгункі больш чым 20 разоў. У месцы перасячэння чыгунак утварыліся чыгуначныя вузлы. Найбуйнейшым па пасажыра- і грузаабароце з’яўляецца Мінскі чыгуначны вузел. Максімальная колькасць напрамкаў чыгунак — па шэсць — сыходзіцца ў Оршы і Баранавічах, па пяць — у Гомелі і Брэсце.

Знайдзіце пералічаныя чыгункі і чыгуначныя вузлы на карце атласа (с. 4–5) і растлумачце, чаму менавіта ў гэтых гарадах вялікая колькасць чыгунак.

**Аўтамабільны транспарт.** Аўтамабільны транспарт з’яўляецца адным з тых, што дынамічна развіваецца. У Беларусі ён з’явіўся ў канцы 20-х гг. XX ст. У цяперашні час павялічваецца колькасць дарог з цвёрдым пакрыццём, будуюцца аўтамагістралі і лагістычныя цэнтры. Агульная працягласць аўтамабільных дарог 102 тыс. км, з якіх 86 % маюць цвёрдае пакрыццё. Дарожная сетка ўключае магістралі, дарогі рэспубліканскага і мясцовага значэння. Магістралі часта ідуць паралельна чыгункам і ўтвараюць адзіныя транспартныя калідоры. Самая густая сетка дарог у Гродзенскай і Мінскай абласцях. Дзяржава надае вялікую ўвагу будаўніцтву новых дарог і рэканструкцыі старых, давядзенню іх да міжнародных стандартаў.

Аўтамабільны транспарт спецыялізуецца на перавозцы грузаў і пасажыраў на кароткія адлегласці. Таму, нягледзячы на самы вялікі аб’ём перавозімых грузаў, аўтатранспарт саступае па грузаабароце чыгуначнаму і трубаправоднаму. Значная ўдзельная вага аўтамабільнага транспарту ў перавозцы пасажыраў і пасажыраабароце. У буйных гарадах і прамысловых цэнтрах створаны цэнтры фарміравання грузаў, у межах транспартных транс’еўрапейскіх калідораў — лагістычныя цэнтры.

**Трубаправодны транспарт.** Гэты від транспарту ў Беларусі з'яўляецца адным з самых маладых. Ён выкарыстоўваецца для перавозкі нафты і нафтапрадуктаў, прыроднага газу. Сваё развіццё ён атрымаў у другой палове XX ст. Па аб'ёмах перавозкі грузаў трубаправодны транспарт толькі крыху саступае аўтамабільнаму і чыгуначнаму. Па грузаабароце ён знаходзіцца на першым месцы. Яго ўдзельная вага ў грузаабароце складае амаль 50 %. Працягласць магістральных трубаправодаў на тэрыторыі Беларусі ў два разы пераўзыходзіць даўжыню чыгунак і складае больш за 11 тыс. км. Тэрыторыю Беларусі перасякаюць тры магістральныя нафтаправоды. У краіне праходзяць дзве галіны нафтаправода «Дружба»: з Альмецьеўска (Расія) праз Крычаў — Оршу да Наваполацка, а таксама праз Мазыр — Пінск у Польшчу і Германію. У Мазыры адыходзіць адгалінаванне на поўдзень ва Украіну, у Венгрыю, Славакію, Чэхію. На поўначы краіны пабудаваны нафтаправод з Сургута (Расія), па якім нафта падаецца ў Наваполацк і далей да Вентспілса. Паралельна нафтаправоду «Дружба» пабудаваны транзітныя нафтапрадуктаправоды. Трэці нафтапрадуктаправод працуе для ўнутраных патрэб. Ён праходзіць па лініі Наваполацк — Вілейка — Фаніпаль.

Значна лепш развіта сетка магістральных газаправодаў. На яе долю прыходзіцца прыкладна 65 % трубаправодаў. Праз тэрыторыю Беларусі ажыццяўляецца транзіт прыроднага газу з Расіі ў краіны Еўропы, а таксама ў Калінінградскую вобласць. Перасякае тэрыторыю Беларусі і вядомы газаправод «Ямал — Еўропа». Прыродны газ паступае з Расіі па магістральных газаправодах.

**Унутраны водны транспарт.** Водны транспарт у Беларусі мае падпарадкаванае значэнне. Па аб'ёме перавозімых грузаў, грузаабароце і пасажыраабароце ён істотна саступае іншым відам транспарту.

Водны транспарт адносіцца да найбольш танных і самых старых відаў транспарту. Доўгі час рэкі былі асноўнымі шляхамі зносін. У цяперашні час удзельная вага воднага транспарту ў грузаабароце і пасажыраабароце складае сотыя долі працэнта. Растлумачце, чаму водны транспарт страціў сваё значэнне.

На тэрыторыі Беларусі суднаходства арганізавана на Прыпяці, Дняпры ніжэй Рагачова і часткова ў раёне Магілёва, Бярэзіне ніжэй Беразіно і Сожы ніжэй Веткі. Абмежавана для суднаходства і турысцка-экскурсійнай дзейнасці выкарыстоўваюцца ўчасткі Заходняй Дзвіны (ніжэй Віцебска) і Нёмана (у раёне Гродна). Найбольшае транспартнае значэнне маюць

Прыпяць і Дняпроўска-Бугскі канал. Рэгулярнае кругласутачнае суднаходства ажыццяўляецца на працягу ўсяго 500 км, або менш чым 10 % ад магчымага. Для ажыццяўлення перавозкі грузаў і пасажыраў створана 9 партоў і некалькі прыстаней. Самымі вялікімі па грузаабароце з'яўляюцца рачныя парты ў Брэсце і Гомелі.

Узгадайце, якія каналы выкарыстоўваюцца для перавозкі грузаў, і знайдзіце іх на карце атласа (с. 50).

**Паветраны транспарт.** У эпоху глабалізацыі істотна ўзрасла роля паветранага транспарту. У Беларусі ён амаль цалкам выкарыстоўваецца для выканання міжнародных перавозак. Па аб'ёме перавозак грузаў ён займае апошняе месца, а па грузаабароце апярэджвае толькі водны транспарт. Аэрапорты ў Беларусі размяшчаюцца ў абласных гарадах, аднак колькасць авіярэйсаў з іх невялікая. Аэрапортам міжнароднага значэння з'яўляецца Нацыянальны аэрапорт «Мінск» (мал. 166). Кампанія «Белавія» і шэраг замежных авіякампаній ажыццяўляюць авіярэйсы ў гарады СНД, Еўропы, Азіі і Амерыкі.



Мал. 166. Нацыянальны аэрапорт «Мінск»

**Абагульнім і запомнім.** У краіне найбольш развіты чыгуначны, аўтамабільны і трубаправодны транспарт. Па аб'ёме перавозімых грузаў лідзіруе аўтамабільны транспарт, па грузаабароце — трубаправодны, па пасажыраабароце 1-е месца займае аўтамабільны.

1. Што ўваходзіць у склад транспартнай сістэмы Беларусі? 2. Якія віды транспарту развіты на тэрыторыі Беларусі? 3. Якія населеныя пункты, акрамя абласных цэнтраў, з'яўляюцца транспартнымі вузламі і чаму?

4. Чаму па аб'ёме перавозімых грузаў у Беларусі лідзіруе аўтамабільны транспарт, а па грузаабароце — трубаправодны? 5. Чаму водны і паветраны транспарт маюць нізкія паказчыкі па грузаабароце і пасажыраабароце? 6. Якія віды транспарту з'яўляюцца найбольш перспектыўнымі ў цяперашні час?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Статус магістральных у Беларусі маюць 12 аўтадарог, знайдзіце іх на карце атласа і вызначце: а) якія гарады яны звязваюць, б) якія з аўтамагістралей з'яўляюцца часткамі трансеўрапейскіх транспартных калідораў.